№ 17 (706)
Май 2018 года

Краязнаўчая газета

Выдаецца з красавіка 2003 года

bfk.by

У нумары:

☞ Асобы: *актрыса Любоў Румянцава, спартсменка Тамара Шыманская –* *стар. 2 і 7*

☞ Круглы стол: *Малой радзіме – вялікую ласку –* *стар. 4-5*

☞ «Вянок»: *рубрыка да 105-годдзя з дня выхаду –* *стар. 6*

Карціна Віктара Коласа з Бярэзінскага раёна

Падрабязней чытайце на стар. 3

На тым тыдні...

✓ **26 красавіка** ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі адкрылася **XIV Міжнародныя кнігазнаўчыя чытанні і міжнародная выстаўка «Буквары народаў свету»**. Выстаўка прымеркаваная да 400-годдзя выдання нашымі продкамі першага «Буквара» і арганізаваная пры ўдзеле Пасольства Латвійскай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь, Пасольства Рэспублікі Беларусь у Латвійскай Рэспубліцы, Праекта мабільнасці Еўрапейскага Саюза «MOST».

На выстаўцы ўпершыню ў Беларусі прадстаўлена каля 1 400 букваро ў амаль на 600 мовах самых розных народаў пяці частак свету – Еўропы, Азіі, Амерыкі, Афрыкі, Аўстраліі і Акіяніі. Аснова экспазіцыі – унікальная прыватная калекцыя букваро ў і азбук латвійскага педагога, аўтара букваро ў і кніг пра народы свету і іх мовы, калекцыянера Юрыса Цыбульса.

Фота Наталі КУПРЭВІЧ

Распавядае Ю. Цыбульс

Асаблівае месца займаюць беларускія кнігі для навучання грамаце XVI – XXI стст. з фондаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Розныя па складзе, графіцы, мастацкім афармленні, педагагічных прыёмах навучання, яны дэманструюць 400-гадовую гісторыю беларускага буквара.

Выстаўка будзе працаваць да сярэдзіны верасня.

✓ **3 мая** ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа НАН Беларусі адбылася **прэзентацыя навуковай манаграфіі «Грамадска-палітычнае жыццё ў Беларусі 1772 – 1917 гг.»**, якая выйшла ў выдавецтве «Беларуская навука».

Кніга з'яўляецца вынікам працы аўтарскага калектыву, у склад якога ўвайшлі даследчыкі Інстытута гісторыі НАН Беларусі, Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка, Рэспубліканскага інстытута вышэйшай школы, Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. Выданне адметнае тым, што гістарычныя працэсы ў ім паказаныя як на макра-, так і на мікраўзроўнях. Дзякуючы шырокаму колу крыніцаў, новым ракурсам і падыходам, кніга падае не толькі аб'ёмную гістарычную панараму, але і ўводзіць чытача ў супярэчлівы, напружаны, таямнічы свет XIX ст.

Да імпрэзы была падрыхтаваная выстаўка кніг з фондаў бібліятэкі. На ёй прадстаўленая ранняя гістарыяграфія XIX і пачатку XX ст., у прыватнасці, работы, прысвечаныя вайне 1812 года, паўстанням 1830 – 1831 гг. і 1863 – 1864 гг.

✓ **4 мая** ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі адкрылася **выстаўка «Арт-Мінск 2018»**. Яна ладзіцца ў межах міжнароднага фестывалю сучаснага мастацтва «Арт-Мінск», што сёлета праходзіць упершыню.

У галерэі «Ракурс» разгарнулася насычаная экспазіцыя, дзе ўвазе гледачоў прапанаваныя працы вядомых майстроў Мінска і іншых гарадоў Беларусі: жывапісца Мікалая Бушчыка, майстра рэалістычнага пейзажу Уладзіміра Масленікава, майстроў нацюрморту Марыі Ісаёнак і камернага сельскага пейзажу Сямёна Дамарада. Тут жа – тонкая і стрыманая ў сваіх жывапісных імпрэсіях Ілона Касабука, яркі і эфектны Уладзімір Ганчарук, дэкаратыўная Вікторыя Ільіна і многія іншыя.

✓ **7 мая** ў Нацыянальным гістарычным музеі Рэспублікі Беларусь адкрылася **выстаўка «Пад туфлікам у Музы. З гісторыі абутку»**.

Гісторыя абутку налічвае 30 000 гадоў. Яна відазмянялася разам з патрэбамі грамадства, паказвала прыналежнасць гаспадара да пэўнага сацыяльнага класа, адлюстроўвала яго дабрабыт.

Юбілей Любові, якая была Джуліяй

Неверагодна, але будучую актрысу Любоў Румянцаву, якая выканае ў кіно больш за шэсць дзясяткаў роляў, а сваю першую ўзнагароду (дыплом «За лепшае выкананне жаночай ролі») атрымае за вобраз галоўнай гераіні Джуліі ў беларускім фільме «Альпійская балада» паводле аповесці Васіля Быкава, не прынялі ва Усесаюзны дзяржаўны інстытут кінематаграфіі з-за «нефотагенічнага твару». Але Люба не разгубілася і адразу падала дакументы ў Дзяржаўны інстытут тэатральнага мастацтва імя А. Луначарскага, які паспяхова скончыла ў 1964 г.

Тэатральны лёс актрысы пачаўся ў знакамітым маскоўскім тэатры на Малой Броннай, потым былі сцэны мінскіх Рускага драматычнага тэатра імя М. Горкага і Тэатра-студыі кінаакцёра.

Безумоўна, у гісторыі беларускага кінематографа (і ў сэрцах гледачоў) галоўнай роллю Л. Румянцавай назаўсёды застанецца вобраз Джуліі.

Сёлета 18 красавіка актрыса адзначыла свой 75-гадовы юбілей. Урачыстасці прайшлі ў мінскім кінатэатры «Масква». Павіншаваць заслужаную артыстку Беларусі, члена Беларускага саюза кінематаграфістаў прыйшлі афіцыйныя асобы, калегі, сябры і ўдзячныя гледачы.

Уступам да віншаванняў стала дэманстрацыя фільма «Альпійская балада». А ў фае кінатэатра былі выстаўленыя касцюмы Івана і Джуліі.

Першы намеснік міністра культуры Ірына Дрыга ўручыла юбілярцы падзяку прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь. Павіншавалі Любоў Рыгораўну і ўручылі ганаровыя граматы, нагрудны знак і памятныя сувеніры генеральны дырэктар кінастудыі «Беларусьфільм» Уладзімір Карачэўскі, прадстаўнікі ЦК прафсаюза работнікаў культуры, інфармацыі, спорту і турызму, прафкама кінастудыі «Беларусьфільм», Беларускага фонду культуры, Беларускага саюза кінематаграфістаў, Беларускай гільдыі акцёраў кіно. Адмысловы торт – «Альпійская балада» з партрэтам маладой актрысы, выраблены мінскім хлебазаводам № 2, – паднеслі калегі з Тэатра-студыі кінаакцёра. Яго галоўны рэжысёр Аляксандр Яфрэмаў зачытаў тэлеграму з віншаваннем ад Гільдыі акцёраў кіно Расіі.

«КГ» далучаецца да віншаванняў і жадае Любові Рыгораўне моцы, творчага даўгалецця і новых роляў.

Наталі КУПРЭВІЧ
Фота аўтара

Дзе варта пабываць

Сюррэалізм у цэнтры Мінска

Урачыстае адкрыццё экспазіцыі «Мастак і горад» адбудзецца ў Мінску 17 мая. Выстаўка традыцыйна будзе праходзіць на плошчы Якуба Коласа пад адкрытым небам. Гарадскі праект сёлета прадставіць працы знакамітага жывапісца Георгія Скрыпнічэнкі – знакавай постаці ў айчынным выяўленчым мастацтве. Маштабная выстаўка цягам больш як пяці месяцаў будзе адкрытая для жыхароў і гасцей Мінска, а з 20 верасня працягне экспанаванне ў Віцебску.

17 мая на святочным адкрыцці плошча Якуба Коласа паглыбіцца ў дзіўную атмасферу сюррэалістычнага мастацтва. Выступленне вулічных акцёраў, унікальная абстаноўка і сюрпрызы чакаюць усіх наведнікаў у гэты дзень.

Г. Скрыпнічэнка стаяў каля вытокаў айчыннага сюррэалізму. Яго працам уласцівая адмысловая манера выканання на мяжы фантазіі і рэчаіснасці – невыпадкова нашага суайчынніка часта называюць беларускім Сальвадорам Далі. Традыцыйна рэпрадукцыі будуць суправаджацца біяграфіяй мастака і тэкставым апісаннем на трох мовах – беларускай, рускай і англійскай.

Дадатковая інфармацыя аб праекце змешчаная на сайце higminsk.by.

Пяты год генеральным партнёрам экспазіцыі выступае банк ВТБ (Беларусь). Праект рэалізуе камунікацыйная кампанія «GBS» сумесна з Нацыянальным цэнтрам сучасных мастацтваў Рэспублікі Беларусь пры падтрымцы Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь і Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта.

Паводле інфармацыі арганізатараў

Бібліяадпачынак у Мастах

27 красавіка Мастоўская раённая бібліятэка сумесна з раённай дзіцячай бібліятэкай правялі бібліяноч «Падарожжа па кніжным сусвеце». Усе аддзелы бібліятэк на адну ноч ператварыліся ў творчыя пляцоўкі, дзе кожны наведнік змог знайсці занятак па душы.

Зазірнуць у мінулае і будучыню змагла мадам ля Бук, якая сустракала гасцей у сваім салоне на літаратурнай пляцоўцы «Сад класікі». Наведнікам спадабалася бібліятэчная варажба мадам ля Бук на тамах класічных твораў з кніжнай выстаўкі «Залаты россып класікі».

Пад час бібліяночы адбылася сустрэча з пісьменнікам, сябрам Саюза пісьменнікаў Беларусі Дзмітрыем Вінаградавым. У літаратурна-музычнай гасцёўні «Натхненне» можна было паслухаць выступленні мясцовых паэтак Зоі Касьяновіч і Галіны Васілеўскай, працягнуць знаёмства з творчасцю Д. Вінаградава і з роднымі ўздзенскага пісьменніка, якія жывуць у Мастах.

Была таксама магчымасць паўдзельнічаць у літаратурным бібліякараоке – прачытаць вершы ў суправаджэнні класічнай і сучаснай музыкі. Чытальнік загадзя не ведаў, які будзе чытаць верш і пад якую музыку – ён павінен быў інтуітыўна ўлавіць рытм верша і музыкі.

На пляцоўцы «Цуд кахання» разгарнулася кніжная выстаўка літаратуры розных жанраў пра каханне. Там ахвочыя маглі адказаць на пытанні лірычнай віктарыны і паслухаць вершы пра каханне.

На літаратурнай пляцоўцы «Пячора жахаў» хлопчыкаў і дзяўчынак чакалі куфар са скарбамі, чароўная павуціна з мілымі павучкамі. На літаратурна-гульнявой пляцоўцы «Таямніцы начной бібліятэкі» можна было далучыцца да віктарыны-размінкі, шматлікіх конкурсаў, гульняў.

Творчымі нумарамі парадавалі прысутных навучэнцы Мастоўскага раённага цэнтра творчасці дзяцей і моладзі Вікторыя Касцюкова, Вікторыя Дзедзіна, Ангеліна Ціток, Ілона Багдановіч, Ксенія Цяслюк, Караліна Трафімчык і ўдзельніца вакальнага гуртка Дубненскага цэнтра вольнага часу і культуры Лізавета Каробкіна.

Вольга КОРШУН,
метадыст аддзела бібліятэчнага маркетынгу Мастоўскай раённай бібліятэкі



Сустрэча з Д. Вінаградавым

Рэдкалегія і рэдакцыя «Краязнаўчай газеты» шчыра ўдзячная нашым чытачам і аўтарам за ўвагу да нашага выдання. Але, на жаль, часам бываюць прыкрыя выпадкі, што ўскладняюць падрыхтоўку артыкула ды ілюстрацыяў да друку. На гэта і хочацца звярнуць увагу сяброў.

Тэкст. Артыкул або нататка павінны быць набраныя ў тэкставым рэдактары Microsoft Word, захаваныя ў фармаце **.rtf**, як варыянт – **.doc**, але не .docx (на жаль, гэты фармат на сёння дае найбольшую колькасць памылак з-за збою). Як варыянт, могуць быць і іншыя тэкставыя рэдактары (да прыкладу, бясплатныя AbiWord або OpenOffice ды падобныя), але абавязковая ўмова — захоўваць у фармаце **.rtf**. Шрыфт (гарнітура, памер, іншыя параметры, а таксама абзацныя водступы) можа быць абраны самастойна (мы прапануем Arial, 13 пунктаў, паўтара інтэрвала, водступ 1,25 см).

Пазначайце па магчымасці поўнасцю імёны і прозвішчы асобаў, згаданых у тэксце, расшыфроўвайце ініцыялы аўтара артыкула, а таксама абрэвіятуры і скарачэнні. Звяртаем таксама ўвагу, што неабходна дасылаць канчатковую версію артыкула, па магчымасці не дадаваць да яго пазней звесткі, факты, удакладненні, новы варыянт дасланага раней, каб у канчатковай публікацыі не ўкралася тэхнічная памылка з-за падрыхтоўкі і ўнясення сказа, абзаца і да т.п. Як варыянт, газета можа пазней вярнуцца да надрукаванага і змясціць артыкул ці нататку ў працяг тэмы.

Газета друкуе матэрыялы на беларускай мове; рэдакцыя перакладае тэксты ў скрайніх выпадках, загадзя агавораныя пры сустрэчы, па тэлефоне або праз электронную пошту.

Ілюстрацыі. Малюнкі, рысункі, фотаздымкі павінны быць захаваныя ў фармаце **.jpg (.jpeg)** або **.tiff**. Пажадана **300 кропак** на цалю (dpi), дапускаецца не меней за **1024 пікселяў** па большым баку ці памерам не менш за **500 кілабайт**. Ілюстрацыі не трэба ўстаўляць у тэксты дакумент, а прымацоўваць асобна або архіваваць некалькі фота (малюнкаў) і прымацоўваць да пісьма архіў. Не забывайцеся пазначаць, на якой ілюстрацыі хто або што адлюстраваны. Калі ёсць магчымасць, пазначайце аўтарства здымка або малюнка, рысунка (або крыніцу іх паходжання).

Што ж да фота на паперы, то не дасылайце, калі ласка, ксеракопіі ілюстрацыяў.

Просім сяброў звярнуць увагу на гэтыя просьбы і рэкамендацыі пры супрацоўніцтве з рэдакцыяй «Краязнаўчай газеты». Спадзяемся, нашыя стасункі будуць плённыя і зычлівыя.

Будзем разам рабіць нашую з вамі «Краязнаўчую газету»!

Дзе блукала басаногае маленства

Бярэзіншчына – радзіма мастака Віктара Коласа, які амаль 15 гадоў жыве ў ЗША. Яна ж крыніца натхнення і свежых сілаў, імпульс для творчасці, з ёй, роднаю старонкай, звязаныя яго самыя цёплыя ўспаміны, час станаўлення асобы і творцы.

Нарадзіўся В. Колас у вёсцы Барсукі Бярэзінскага раёна. Вучыўся ў Замастоцкай пачатковай школе, затым у Высакагорскай сярэдняй школе. На невялічкай рачулцы Плаўня, не раз адлюстраванай у творах мастака, праводзіў разам з сябрамі свае летнія канікулы, дзе купаліся, загаралі, адпачывалі ад сялянскай працы. Па 8-м класе В. Колас вучыўся ў Мар'інагорскім сельскагаспадарчым каледжы, пасля заканчэння якога служыў у арміі, затым працаваў у аграпрамысловым комплексе Бярэзінскага раёна.

Улюбёны ў прыгажосць роднай прыроды, ад'язджаючы далёка за межы Беларусі, Віктар Анатольевіч быццам занатаваў для памяці кожны куточак сваёй радзімы – бярэзінскай зямлі. У ЗША малюе беларускую прыроду, прыгадваючы яе да драбніцаў. У творах акумулюе любоў да зямлі, якая ўзгадавала яго, выпесціла і сёння надае яму імпульс для творчасці, сілы і энергію; ён адчувае сваю роднасць з бярэзінскім краем, і гэта насычае яго асалодай і прагай да жыцця, натхняе на стварэнне новых мастацкіх твораў.

Пра сваю нязгасную любоў да роднай зямлі, якая акрыляе яго, Віктар усхвалявана прызнаўся на адкрыцці адной з выставак у ЗША, куды прыехалі яго суайчыннікі не толькі з Чыкага, але і Канады, Партугаліі. «Тое, што падштурхнула нас пакінуць Беларусь, зусім не азначае, што мы перасталі любіць яе, – шчыра прызнаўся Віктар. – Я б нават сказаў, што адбылося наадварот. Знаходзячыся ўдалечыні, пачынаеш адчуваць, што яна, родная старонка, стала бліжэйшай і даражэйшай. Хіба можна забыць сельскія сцяжынкі, па якіх бегаў у школу за 5 кіламетраў ад дома, пахі свежаўзаранага поля, сена, смак бярозавага соку, чароўныя спевы салаўя і малінаўкі? Беларускія краявіды самі просяцца на палотны. Я рады, што маё захапленне жывапісам дало мне магчымасць выказаць свае пачуцці пры дапамозе пэндзля і фарбаў».

У прадмове да свайго альбома «Родны край у памяці мастака», што выйшаў у 2016 годзе ў мінскім выдавецтве «Кнігазбор», В. Колас слушна адзначае: «На планеце Зямля шмат прыгожых мясцінаў. Але, на маю думку, самае прыгожае і блізкае сэрцу месца – гэта дзе ты нарадзіўся, вырас, дзе пайшоў у першы клас, дзе гучаў вальс выпускнога балю. Адкуль я пайшоў у самастойнае жыццё». З густам зробленае выданне аздабляюць паэтычныя радкі Якуба Коласа, а таксама нашага земляка Рамана Чарапахі, вядомага бярэзінскага гарманіста, у мінулым выкладчыка Бярэзінскай школы мастацтваў, шматгадовага кіраўніка народнага ансамбля песні «Лявоніха» Бярэзінскага РДК, які цяпер таксама жыве за мяжой і піша кранальныя вершы, выказваючы ў іх сваю любоў да роднай старонкі, замілаванне яе прыгажосцю, сум ад вымушанага расстання:

Яшчэ не ўсё з мінулага
растрачана,
Яшчэ вяртае памяць
асцярожна.
Дзве каляіны коламі
пазначаны,
Што ў даль пралеглі
на траве мурожнай.
Бярозавая бель
і сосны стромкія
Прасцягліся ажно
да небакраю.
У тых гаях
і ў лугах рамонкавых
Маленства басаногае блукае.

Акрамя карцінаў пейзажнай тэматыкі, у В. Коласа ёсць некалькі твораў, прысвечаных землякам – удзельнікам Вялікай Айчыннай вайны. З'явіліся яны невыпадкова. Шчыра зацікаўлены гісторыяй роднага краю, ён сабраў звесткі пра аднавяскоўцаў – салдатаў Чырвонай Арміі, удзельнікаў партызанскіх атрадаў, пра загінулых, пра тых, каму пашчасціла вярнуцца з вайны дадому. У памяць пра іх стварыў творы, два з якіх («Агні партызанскіх кастроў» і «З перамогай дадому») знаходзяцца ў фондзе мінскага музея Вялікай Айчыннай вайны.

Віктар Колас

Уважлівы да дробязяў, стрыманы, але з адкрытым сэрцам, затоена сумны, але не расчараваны, Віктар Анатольевіч шчаслівы, бо ў ягоным сэрцы заўсёды жыла любоў да бацькоў, сям'і і родных мясцінаў. Такім быў і пад час адной з сустрэчаў летась, калі з жонкай Зінаідай завітаў у рабочую групу па стварэнні Бярэзінскага раённага гісторыка-краязнаўчага музея і перадаў у дар для будучага музея некалькі карцінаў і рэпрадукцыі з выявай горада і мясцовых краявідаў, а таксама матэрыялы, звязаныя з творчай дзейнасцю, сярод якіх альбом «Родны край у памяці мастака» з аўтографам бярэзінца. Пакінуўшы ў дарунак свае карціны, ён пакінуў на Радзіме частку сваёй душы, добры ўспамін пра сябе.

Асоба нашага земляка мастака В. Коласа, які далёка за межамі Беларусі сумленна жыве і працуе, займаецца любімай справай і не парывае сувязяў з роднай старонкай, апявае яе прыгажосць і тым праслаўляе яе, выклікае бязмежную павагу і з'яўляецца ўзорам для пераймання, як годна трэба жыць, захоўваць сваю любоў да зямлі, якая нарадзіла і выпеставала цябе.

Алена ЖДАНОВІЧ,
краязнаўца

Новыя кніжкі пра Мёршчыну

Дзякуючы вучонаму-гісторыку з Беластока Кшыштафу Ёдчыку мы атрымалі копіі старонак кніг, якія нядаўна пабачылі свет у Польшчы і маюць дачыненне да нашага краю. Так, выйшла з друку на польскай мове кніга даўняга даследчыка Віленшчыны Гжэгажа Рэнкоўскага пад назваю «Крэсовы рэзідэнцыі Віленскага ваяводства». Гэта працяг яго першага выдання «Смак крэсаў» (Варшава, 2000), што было напісанае ў форме падарожжа па Віленшчыне з паглыбленнем у гісторыю. Апошняе выданне прысвечанае толькі сядзібам шляхты. Чытачу з Мёршчыны будзе цікава даведацца аб гісторыі сядзібаў у Дзедзіне, Каменполлі, Забалоцці, Лявонпалі. З рэзідэнцыяў шляхты, што не былі змешчаныя ў першым выданні, тут мы знаходзім кароткае апісанне маёнтка Медунецкіх у Горках. У новай кнізе даследчыка з Польшчы мы знойдзем і цікавыя фотаздымкі, якіх не было ў папярэднім выданні.

Пабачыла свет і чарговая кніга ксяндза – даследчыка касцёлаў і жыцця святароў нашага краю – Тадэвуша Краэля «Мартыралогія дыяцэзіі Віленскай». У ёй змешчаныя і звесткі пра святароў мёрскай зямлі, якія пацярпелі ад рэпрэсіяў пры сацыялізме і фашызме. Вось іх прозвішчы. Ксёндз Юзаф Інгялевіч, святар касцёла ў Новым Пагосце ў 1937 – 1949 гадах, які быў арыштаваны і шэсць гадоў прабыў у сталінскіх лагерах. Ян Пяркоўскі – з 1932 года ксёндз-адміністратар парафіі ў Баболеве каля Дрыгучаў – зведаў фашысцкія турмы. Францішак Куксевіч быў святаром Мёрскага касцёла ў 1937 – 1941 гадах, арыштаваны і расстраляны чэкістамі пад час канвою на ўсход з турмы ў Беразвечы 26 чэрвеня 1941 года. Ян Жук нарадзіўся ў вёсцы Мацюкі, служыў ксяндзом у Новым Пагосце, арыштаваны бальшавікамі ў 1940 годзе, 16 гадоў правёў у сталінскіх лагерах, пасля вызвалення праводзіў душпастырскую дзейнасць у Польшчы.

Вітаўт ЕРАМАЛЁНАК
(Паводле выдання «Мёрская даўніна», № 1 за 2018 г.)

Рабіць і на малой радзіме –

Сёлетні год абвешчаны Годам малой радзімы. Усім, хто ўсур'ёз заклапочаны яе лёсам, відавочна, што зрабіць трэба нямала і што задачы пастаўленыя маштабныя.

У той жа час малая радзіма патрабуе ўвагі не толькі сёлета. Нашая зямля заўсёды адгукаецца на клопат – як цяпер, як сто гадоў таму, так і ў будучыні, калі на ёй будуць жыць нашы нашчадкі. Што сёння адбываецца ў невялікіх вёсачках? Ці ведаюць жыхары раённых цэнтраў пра тыя цікавосткі, што іх атачаюць? Якія захады варта зрабіць на ўзроўні ўсёй краіны?..

Адказы на гэтыя і некаторыя іншыя пытанні шукалі пад час круглага стала, арганізаванага Выдавецкім домам «Звязда» і рэдакцыяй «Краязнаўчай газеты», ГА «Беларускі фонд культуры». Удзел бралі дырэктар – галоўны рэдактар Выдавецкага дома «Звязда» Павел СУХАРУКАЎ, галоўны рэдактар «Краязнаўчай газеты» Уладзімір ГІЛЕП, старшыня Беларускага фонду культуры Тадэуш СТРУЖЭЦКІ, намеснік старшыні БФК Анатоль БУТЭВІЧ, старшыня Пастаўскага раённага аддзялення Таварыства беларускай мовы краязнавец Ігар ПРАКАПОВІЧ, выканаўчы дырэктар маладзёжнага аб'яднання «Гісторыка» Таццяна ПЯТРОВА, вядучы навуковы супрацоўнік Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы музеязнаўца Павел КАРАЛЁЎ, навуковы супрацоўнік Лідскага гісторыка-мастацкага музея Алесь ХІТРУН.

Анатоль Бутэвіч: Круглы стол, які праводзяць рэдакцыі газеты «Звязда» і «Краязнаўчай газеты», сабраў лепшых людзей з краязнаўчага поля Беларусі, каб пагаварыць на тэму, што актуальная сёлета, у Год малой радзімы. А як на мой погляд, гэта своечасовая назва года, бо і да гэтага часу было нямала карысных справаў, якія ўшаноўвалі малую радзіму. Гэтая тэма не была забытая ніколі і нікім – ні краязнаўцамі, ні мясцовымі жыхарамі, ні сродкамі масавай інфармацыі. Задача круглага стала – зірнуць, можа быць, новымі вачыма і не столькі хвалячыся, што зрабілі, а вызначыцца з тым, што трэба канкрэтна зрабіць. Хацелася б, каб адбылася не тэарэтычная размова, каб не атрымалася, што мы некаму ставім задачы, а гутарка, што б мы хацелі, што б мы маглі зрабіць, каб нашыя акцыі, справы засталіся рэальнымі здзяйсненнямі.

Наша малая радзіма – як правіла, на маё разуменне, гэта вясковы стыль жыцця. Беларусь заўсёды была сельскай краінай. На жаль, на сённяшні дзень адбываецца імкненне ўсіх у мегаполіс. «Вось прыедзем у вялікі горад, там нешта прыдбаем, і будзем жыць багата», як усё роўна нічога не робячы, паклаўшы нага на нагу... Але на шчасце – адбываецца і адваротны працэс. Людзі пачынаюць разумець, што мегаполіс – не панацэя, не ўцёкі ад рэальнага жыцця, якога мы хацелі пазбыцца. Наадварот, пачынаецца працэс, калі з вялікіх гарадоў з'язджаюць у маленькія вёсачкі. І там жывуць, там ствараюць.

У беларускай тэрміналогіі што было? Хутар (калі браць Заходнюю Беларусь), вёска, сяло, мястэчкі былі. Не ведаю, ці маю рацыю, але для мяне баліць сітуацыя, калі мы міжволі выкрэслівалі з нашага ўжытку, жыцця вёску. Не толькі таму, што перамяшчаемся самі ў мегаполіс, і тыя вёскі знікаюць, але нават у самім, калі хочаце, адміністрацыйным рэсурсе. Можна згадаць, як побач з даўняй-прадаўняй вёскай з'явіліся аграгарадкі. На мой погляд, сама назва ўжо вымушае нас адарвацца ад зямлі. Мы ж жывем у АГРАГАРАДКУ, а не на зямлі. І можа, гэта становіцца прычынаю, што мы часам абыякава ставімся да некаторых праблемаў, што на мясцовым узроўні ўзнікаюць. Можа, гэта адна з прычынаў, што сёння сельскія жыхары перасталі мець уласныя гаспадаркі ў тым жа аграгарадку. Ці не гэтым самым адрываемся мы ад зямлі, ад каранёў. Мы былі традыцыйна моцныя каранямі. Наша малая радзіма там, дзе пахаваныя нашыя продкі. На могілках і сёння знаходзім пахаванні выбітных людзей, звязаных з нашымі магутнымі родамі. Бывае, што і ў смеццевых кантэйнерах ляжаць цэлыя пакункі сямейных фотаздымкаў. Унукам-праўнукам яны непатрэбныя, бо чорна-белыя, старыя... Але ж гэта фіксацыя таго жыцця, якое было. Колькі яшчэ такіх здымкаў захоўваецца ў нашых хатах, на гарышчах! А сабраўшы іх, ці не з'явіцца які новы Ліхадзедаў, які збярэ гэты фактаалагічны матэрыял, захавае яго нашчадкам. Пэўным чынам і БФК, і «КГ» удзельнічаюць у гэтым працэсе.

Я хацеў бы, каб мы перайшлі да практычнай гаворкі. ШТО мы маем, ШТО трэба зрабіць – і нам у тым ліку. Другі аспект: мы хочам аб'явіць, магчыма, з удзелам рэдакцыяў «КГ» і «Звязды», конкурс на тэму малой радзімы і для краязнаўцаў, і для людзей неабыякавых. Каб тая радзіма была ўшанаваная не толькі імёнамі, да прыкладу, Барыса Кіта, Ігната Дамейкі ці іншых знаных асобаў, але і тымі ж настаўнікамі, якія рабілі, здавалася б, нябачную справу і зрабілі з нас асобаў, пры якіх стваралися і школьныя музеі. Каб гэтыя імёны сталі славутыя. Гэта адзін з напрамкаў. Можаце сёння падказаць іншыя.

Павел Сухарукаў: Сёння не мы тут галоўныя, а краязнаўцы, якія хочуць падзяліцца сваімі ідэямі наконт развіцця гэтай вельмі важнай тэмы.

Я трохі больш чым год мінчанін. Распытваю людзей, шукаю і пакуль што не знайшоў карэннага мінчаніна. Хаця б у 3-4-м пакаленні. Усе мы з малой радзімы. Я вось мастоўскі хлопец, цяпер жыву ў Мінску. Але любоў да родных мясцінаў я назаўсёды трымаю ў сэрцы, заўжды кажу, што калі будзе праца ў Мастах, вярнуся туды з вялікім задавальненнем. Я згодны з Анатолем Іванавічам, што дзяржава бачыць тыя праблемы, якія існуць у гэтым накірунку. І тое, што сёлета Год малой радзімы, сведчыць, што гэта трэба выкарыстоўваць. Ці зрабіць дзяржаўную праграму, у шырокім спектры накірункаў. Але ўсё ж галоўнае сёння – чалавек. Вось я мастоўскі, і постаць Алеся Белакоза паказвае нам, як шмат адзін звычайны настаўнік без асаблівай улады зрабіў для сваёй вёскі, для прыцягнення цікавасці найперш моладзі да родных мясцінаў: стварыў музей краязнаўства і музей беларускага ткацтва. Гэта цяпер, калі яго ўжо няма, ператварыла Гудзевічы ў міжнародны цэнтр развіцця краязнаўства. Я бываў там не раз і не два. І бачыў, што ён там працаваў да апошняга свайго дня. Мне падаецца, галоўнае, што хвалю цікавасці людзей да родных мясцінаў (і канкрэтных дзеянняў) мы павінны падтрымаць.

А.Б.: А давайце мы ад нашага стала ці ад нашых газетаў унясем прапанову ўсталяваць мемарыяльную дошку на школе, дзе працаваў Белакоз і дзе ён стварыў два музеі. Гэтая асоба заслугоўвае таго.

П.С.: Няхай гэты круглы стол будзе першым добрым крокам у нашым супрацоўніцтве і з фондам культуры, і з «Краязнаўчай газетай».

Уладзімір Гілеп: Прысутныя ведаюць, што «Краязнаўчая газета» выдаецца з 2003 г., адзначыла ўжо 15-годдзе і выхад 700 нумара. Літаральна з першых нумароў тэмы малой радзімы і славутых імёнаў Бацькаўшчыны займаюць трывалае месца на яе старонках. Чытачы «КГ» – не толькі краязнаўцы, але і бібліятэкі, дзяржаўныя музеі – сталі падпісчыкамі, на вялікі жаль, невялікая колькасць школьных музеяў (хаця ў краіне іх больш за 1500). Нам не ўдалося зацікавіць школы (хутчэй, нават аддзелы адукацыі райвыканкамаў), у нас не хапіла на гэта «рэсурсаў». Хаця менавіта на навучэнскую моладзь разлічаная большасць краязнаўчых матэрыялаў і спецыяльная рубрыка «Школьнае краязнаўства».

З пачатку новага тысячагоддзя БФК распачаў новую праграму «Славутыя імёны Бацькаўшчыны». Выйшлі 2 тамы гістарычных нарысаў аб знакамітых ураджэнцах беларускай зямлі. Калі вярнуцца на 20-годдзе назад, успомніце, хто з нас у прэсе, па тэлебачанні, радыё чуў імёны Якуба Наркевіча-Ёдкі, Канстанціна і Міхаіла Ельскіх, Напалеона Орды, сямейства Ходзькаў, Аляксандра Скірмунта, Канстанціна Астрожскага, многіх іншых. Толькі-толькі на слыху з'яўляліся імёны Радзівілаў, Сапегаў, мы з вялікаю насцярогаю пачалі лічыць сваімі землякамі Адама Міцкевіча, Станіслава Манюшку, Соф'ю Кавалеўскую, Фёдара Стравінскага, род Шастаковічаў. Усе гэтыя імёны ўвайшлі ў першыя 2 тамы «славутых імёнаў». Менавіта праз знакамітых суайчыннікаў «КГ» выйшла на тэму малой радзімы. Тэма ж малой радзімы і тых імёнаў, што яна нарадзіла, – літара «аз», з якой пачынаецца Айчына. Уявіце, колькі нам трэба ўваскрэсіць на шляху ад «аз» да «яць». Тое, што зроблена, – толькі выведка. І краязнаўцы ведаюць, што гэтая разведка часта праходзіць боем.

Што рабіць далей?

Пройдзе Год малой радзімы, застаецца абсалютна не рытарычнае пытанне: «Што зрабіў, чым дапамог сваёй малой радзіме?». Так, і Копысь стане добрым аграгарадком, і справаздачу па годзе зробім... Тут я хачу падтрымаць галоўнага рэдактара «Звязды», які сказаў, што нам патрэбная доўгатэрміновая праграма. Кшталту таго, што мы рабілі ад 1980-х гг. па выданні кнігі «Памяць». Ведаем, з якой цяжкасцю пачыналася яна: ідэя нарадзілася ў аддзеле культуры ЦК КПБ, але хутка авалодала на месцах краязнаўцамі, бібліятэкарамі, музейшчыкамі і партыйнымі работнікамі. Але ідэю не падтрымалі ў ЦК КПСС. Мы павезлі першую кнігу «Памяць», Шумілінскага раёна, яшчэ ў рукапісах, каб узгадніць. Нам сказалі: «Не. Вы хочаце быць наперадзе Расіі? Вы хочаце апярэдзіць Украіну?» Знай сваё месца, Беларусь! І едучы назад, сакратар ЦК кампартыі Беларусі першы раз не пагадзіўся з рэкамендацыямі ЦК КПСС. Сказаў: «Мы будзем рабіць гэтую кнігу». Гэта быў Аляксандр Трыфанавіч Кузьмін. Памятаеце, у кожным раёне былі створаныя спецыяльныя групы, якія працавалі над

вялікія справы

тэмай. Выйшлі кнігі «Памяць» па кожным раёне. Краязнаўцы многа разоў пісалі ў «КГ»: давайце мы працягнем працу над кнігай «Памяць», яна патрабуе дапаўненняў. Так, яна патрабуе дапаўненняў. У мяне нарадзілася такая ідэя: ужо не трэба ствараць спецыяльную рэдкалегію, як было зроблена раней. У нас ёсць рэдакцыя Энцыклапедыі. У нас назапашаны велізарны матэрыял у бібліятэках, музеях, у краязнаўцаў. Я бачу гэта як дапаўненне да кнігі «Памяць» па кожным раёне. Гэта патрабуе, вядома, яшчэ аднаго круглага стала, можа, канферэнцыі. Каб гэтая ідэя зноў авалодала масамі, каб яна стала доўгатэрміновай дзяржаўнай праграмай. Не спыніліся б мы на адным годзе – Годзе малой радзімы, а пайшлі б далей.

А.Б.: Так, Вы маеце рацыю, але я бачу, што працяг можа быць і ў іншым. Паглядзіце, колькі акцыяў мы называлі, што яшчэ не закончаныя. Тая ж акцыя, ініцыяваная «КГ» і БФК, «Полацк – калыска беларускай дзяржаўнасці». Так, мы прадэкларавалі, абвесцілі. А далей – хто што павінен зрабіць? На жаль, справа амаль што стаіць. Таму дэкларацыя добрых акцыяў, што былі аб'яўленыя, патрабуе вельмі карпатлівай працы. Каб нешта адбылося, трэба, каб нехта нешта рабіў на месцах. Каб той жа «звяздоўскі» «Ігуменскі тракт» стаў рэальным трактам, а не публікацыямі на асобныя разрозненыя тэмы, якія не даюць агульнага накірунку. Так, яны даюць уяўленне, што адбываецца ў рэгіёнах, але выкласці іх у нейкую канкрэтную праграму, пакуль што, на мой погляд, не ўдаецца.

Тадэуш Стружэцкі: Я хачу вярнуцца да словаў Сухарукава і Гілепа, што гэта праблема грамадска-дзяржаўная. І яна фармавалася і абвастралася многія дзесяцігоддзі. Успомнім 1990-я гг., калі былі распаўсюджаныя тэрміны «неперспектыўныя вёскі» і «ўзбуйненне населеных пунктаў». Існавалі фактары стрымлівання развіцця фермерства. Іх жа было шмат ахвочых, гэта магло б надаць дыханне і паміраючым вёскам. Нарэшце, праблемы аптымізацыі, што перыядычна ўзнікаюць. А фактычна гэта было мэтавае скарачэнне сацыяльна-культурных установаў на вёсцы. На 1995 г. у краіне было каля 6 тыс. бібліятэкаў і звыш 5 тыс. клубных установаў, у асноўным – сельскіх. Сёння прыкладна 2 700 бібліятэкаў, скарочана больш чым удвая. Яшчэ адна лічба. Дадзеныя Сусветнага банка інфармацыі (надрукаваныя ў інфармацыйна-аналітычным зборніку за 2008 г., пазней не знайшоў): Беларусь уваходзіла ў групу краінаў, дзе сельскае насельніцтва пастаянна змяншаецца, але і мела адзін з самых высокіх паказчыкаў – скарачэнне ў сярэднім 1,6% за год (у свеце 0,6%). Прыклад з той жа «Звязды»: з 2009 па 2014 г. на Магілёўшчыне было скасавана 47 сельскіх Саветаў, а іх функцыі перададзеныя іншым адміністрацыйным адзінкам. Патрэбныя вельмі важныя крокі як з боку дзяржавы, так і з боку ўсяго грамадства па стварэнні ўмоваў для фармавання новых працоўных месцаў, для стварэння сельскай інфраструктуры, для рамонту і аднаўлення дарожнай сеткі і г.д. Грамадства займецца захаваннем сельскіх традыцыяў і адраджэннем памяці аб продках. Вось тады вымалёўваецца логіка, бачыцца перспектыва: дзяржава будзе ініцыяваць і мэтава рэалізоўваць свае задачы, а кожны канкрэтны чалавек будзе бачыць свой удзел, тады мы сапраўды атрымаем сістэму, якая прывядзе да карэнных зрухаў, каб Беларусь захавала свае гістарычныя традыцыі. Безумоўна, яна не стане сельскай, але роля і доля сельскага насельніцтва будзе павышацца. Значэнне яе ў жыцці дзяржавы, грамадства таксама будзе павялічвацца.

На мой погляд, Год малой радзімы не столькі вырашыць праблемы, колькі іх абвострыць, абазначыць і скіруе грамадства на іх вырашэнне.

А.Б.: Тут бы я трошкі не пагадзіўся, па адной праблеме. Гэта дыскусійнае. Мы заўсёды (і я ў тым ліку) чакаем: павінна быць дзяржаўная праграма, дзяржаўнае нешта яшчэ. А можа, нам самім трэба прыдумаць такое, што пасля ляжа ў дзяржаўную праграму? Бо толькі чаканне, што дзяржава нам штосьці зробіць, можа зацягнуцца не дзесяцігоддзі і ніколі тое не адбудзецца (у сілу розных прычынаў, не таму, што дзяржава ігнаруе – у яе дзясяткі іншых падобных напрамкаў, што патрабуюць свайго вырашэння).

Ігар Пракаповіч: Я вывучаю мінуўшчыну Пастаўскага і Мядзельскага раёнаў, таму на гэтую праблему гляджу якраз адтуль. Займаюся школьным краязнаўствам, распрацоўваў сістэму школьнага краязнаўства. Назіранні мае такія. У Беларусі пятая частка насельніцтва жыве ў сталіцы, і я ведаю, што мае вучні заканчваюць гімназію, большасць імкнецца паехаць у Мінск, уладкавацца там на працу. Вядома, гэта ненармальна. У 1970-х гг. на Падзісеншчыне існаваў вяскова-местачковы мегаполіс. Вёска ішла за вёскай, адна заканчвалася, другая пачыналася. Цяпер мы маем: адны могілкі, праязджаем – другія, трэція...Жывых вёсак амаль няма. Гэта сацыяльная праблема... Мы павінны ісці неяк іншым шляхам. Я хацеў бы прапанаваць разглядаць краязнаўства ў двух ракурсах. Першы – даследчая дзейнасць, вывучэнне роднага краю, а другі – асветная дзейнасць на гэтай тэрыторыі, або на ўсёй тэрыторыі Беларусі. Даследчая дзейнасць – гэта краязнаўцы, якія займаюцца з вучнямі, з сябрамі пошукам новых гістарычных фактаў, матэрыялаў. Мяне цікавіць амаль усё, таму я імкнуся збіраць матэрыялы па пэўных тэмах, у т.л. па знакамітых асобах. Да прыкладу, у Паставах была школа парфоснага палявання. Што такое парфоснае паляванне, мала хто ведаў нават у музеі. Я заняўся тэмай – у выніку выйшла невялікая брашурка. Цяпер у музеі маем прысвечаную яму выставу. Яшчэ тэма – Першая сусветная вайна. У 1990-я гг. мы пачыналі хадзіць з вучнямі, запісваць, наносіць на карты пахаванні, месцы былых умацаванняў. З'явіліся публікацыі, разам з дачкой напісалі кнігу. Сёння ёсць у Паставах і музейная экспазіцыя, прысвечаная гэтай вайне, напэўна, будзе стварацца экспазіцыя пад адкрытым небам. Цяпер дзейнічае валанцёрская арганізацыя «Заходні рубеж», якая займаецца аднаўленнем закінутых помнікаў не толькі рускіх, але і германскіх салдатаў. Збор матэрыялаў выліваецца ў канкрэтную дзейнасць, якую можа скарыстоўваць і дзяржаўная арганізацыя. Гэта дае магчымасць потым развіваць турыстычны патэнцыял рэгіёна.

Асветніцкая дзейнасць. Нашыя вучні лепш ведаюць Амазонку, Конга ды Кардыльеры, чым сваю мясцовасць. Пытаюся, якая самая вялікая рака ў Пастаўскім раёне – праблема. Якое самае глыбокае возера?.. У нас у раёне хоць уведзены факультатыўны курс «Краязнаўства», амаль ва ўсіх школах (1 гадзіна на тыдзень). Створаны дапаможнік «Чароўны край – Пастаўшчына», які ёсць у кожнай школе. У нас і начальнік аддзела адукацыі такі, што ўзяў на сябе ініцыятыву сабраць грошы, каб яго выдаць. Наклад 400 асобнікаў, для раёна нядрэнны. Ёсць дадатак – сшытак на друкаванай аснове «Ці ведаеце вы Пастаўскі край?». У ім у адпаведнасці са зместам дапаможніка пытанні, заданні, фотаздымкі. Напрыканцы мінулага года выйшла мая кніжка «Край беларускага сэрца – Мядзельшчына», яе таксама можна выкарыстоўваць у школах, наклад скіраваны ў школы Мядзельскага раёна. Увогуле, пажадана, каб у кожнай школе быў курс па вывучэнні роднага краю.

Трэба займацца папулярызацыяй і саміх краязнаўцаў. Яны выдаюць кніжкі, звычайна за свой кошт, невялікімі накладамі, пра якія мала хто ведае... Хоць некаторыя бываюць вельмі цікавыя. Цяпер я падрыхтаваў даведнік «Даследчыкі роднага краю». Тут каля 70 персаналіяў, поўнае дасье на краязнаўцаў.

Яшчэ можна многа рабіць праз інтэрнэт: ствараць базу па сваім раёне, каб быў адзіны сайт па раёне, дзе сабраная ўся інфармацыя.

А.Б.: Вы сказалі, што зрабілі самі. І зроблена шмат насамрэч. Тым не менш, калі зірнуць на праблему Вашым вопытным вокам (выданне кніг – адзін з аспектаў ушанавання малой радзімы), што яшчэ магло б быць? Казалі, што едзеш і бачыш на месцы вёсак адны могілкі. Так, калі сёння падлічыць у Беларусі (ніхто, відаць, такую статыстыку не вёў), то страчаных вёсак будзе больш, чым тых, што існуюць сёння... А што нават для тых, зніклых вёсак, можна рабіць, каб захаваліся ў людской памяці? Там жа людзі жылі, і выбітныя асобы маглі быць, і справы былі... Якім чынам зафіксаваць гэтую гісторыю малых радзімаў, зніклых вёсак?

І.П.: Складанае пытанне. У нас у раёне ёсць в. Рымкі. Стаіць царква, а ніводнага жыхара ўжо няма. Напісалі мы кніжку і прапанавалі ідэю. Вёска знаходзіцца ў тупіку, там сцякаюцца тры рэчкі. Не было дарогі. Калі пракласці дарогу праз Дзісну, пайшоў бы рух, можа, у вёску нехта вярнуўся б. Абмяркоўвалі гэта з кіраўніцтвам раёна – нерэальна пабудаваць мост праз Дзісну, дарага. Другі варыянт. Ёсць хрысціянскія абшчыны. Колькі манахаў прыехала б, пасяліліся і ператварылі б гэта месца ў рай на зямлі. Таксама чамусьці руху няма. У нас, ведаю, у в. Хрыстова ёсць чалавек па прозвішчы Татаранка. Ён за свой кошт вырабляе шыльды ў гонар вёсак, што зніклі, і ставіць у месцах, дзе яны былі. Ці патрэбна? Але хаця б так!

У.Г.: Вядома, патрэбна. Гэта ўжо аб'ект турызму.

А.Б.: Мы маем падобны прыклад у Вілейскім раёне. Там некалькі гадоў таму была праведзеная акцыя па ўшанаванні зніклых вёсак. Зрабілі своеасаблівы парк – усталявалі памятныя знакі кожнай са зніклых вёсак. Але працэс ідзе, знікаюць вёскі і сёння. Ці не атрымаецца, што мы хутка будзем мець усю зямлю ў камянях, дзе напісана, што «тут была вёска». Але ж забыцца мы таксама не маем права.

Традыцыі былі, вяселлі гулялі, фэсты праводзілі, іншыя святы. А можа, ушанаваць праз запіс успамінаў на мясцовым узроўні, калі няма каму напісаць кнігу? Абазнаным людзям, можа, браць мікрафон, ехаць і фіксаваць, нават калі не друкаваць. Каб засталося ў бібліятэцы, музеі. Прыйдзе час, можна будзе скарыстаць. Ці скарыстаць у інтэрнэце, ці якім іншым спосабам. Але важна, каб гэта было зафіксаванае ад людзей, якія бачылі, а не ўспаміны з успамінаў. Тут, падаецца, таксама поле дзейнасці ёсць.

І.П.: Так, мы і запісваем жыхароў.

А.Б.: А можа, у працяг сказанага Гілепам пра славутых асобаў, кнігу «Памяць» распаўсюдзіць і на зніклыя вёскі? Будзе ўшанаванне і людзей, і саміх вёсак – што існуюць, і што зніклі. Калі гісторыя раёна будзе пададзеная праз гісторыю вёсак, будзе бачна і што засталося, і што страчанае. Гэта – адзін з шляхоў фіксацыі?

Да друку падрыхтавалі
Уладзімір ГІЛЕП і Уладзімір ПУЧЫНСКІ
Фота Уладзіміра ПУЧЫНСКАГА

(Заканчэнне ў наступным нумары)

«Вэсна» і кветнік гарадчанак

(Заканчэнне. Пачатак у № 16)

Растуць, цягнуцца да сонейка і больш познія кветкі. Здаецца, што сама вясёлка сотнямі адценняў рассыпае па зямлі барву: чырванеюць стромкі флокс і кусцістая сальвія, зіхаціць аранжавыя касмея і рудбекія, у жоўты колер увабраліся тагеціс і шафран, зелянее сціплая рэзеда, блакітнымі вочкамі пазірае лабелія, сінімі галоўкамі прыветліва ківае кампанула, цягнецца ўгару ружавата-фіялетавы павой, і пахнуць, кружаць водарам галаву духмяны гарошак і мацыёла. Дадамо сюды бяссмертнік, вербену, вяргіню, ільвіны зеў, гладыёлусы, цынію, багатую нявесту... І гэта яшчэ не поўны пералік жыхароў расліннага царства вакол сядзібаў гарадчукоў. Трэба зазначыць, што гандляры прывозілі *«з вэсны»* насенне новых відаў кветак для развядзення, якія прыжываліся на тутэйшых агародах і ўзбагачалі мясцовы слоўнік. І ўсё ж самыя любімыя кветкі гарадчанак – махровыя астры: белыя, ружовыя, ярка-чырвоныя, сінія. Кожны гатунак заўсёды сеюць воддаль адзін ад аднаго, *«коб ні пэрэпуліліса»* – гэта значыць, каб захаваўся гатунак.



Прыбіраць агароды пачыналі ў канцы жніўня пасля свята Успення (па-мясцоваму *Спленья*). *«Спленье – цягні бульбу за корэнье»* – кажа народная мудрасць. Пад час уборкі па даўняй завядзёнцы ў апошняй разоры пакідалі вялікі клубень, каб *«зэмэлечцы-маці подзяку отдаці»*. А з нагоды свята Прачыстая (мясцовае *Прэчыста*) гавораць: *«Прэчыста йдзэ да й пчолонькі вэдзэ»*, *«Прэчыста – у полі чысто»*, і да замаразкаў агароды прыбіраліся *довуронду* – гэта значыць поўнасцю.

І ўжо ў хатах праходзіў заключны этап падрыхтоўкі тавара-насення для гандлю. Насенне перамервалі шклянкамі і вялі ўлік, колькі чаго *напахалі* (сабралі). Калі чаго не хапала – дакуплялі, а што зарадзіла багата – прадавалі на мясцовым базары. Тады хаты гарадчукоў напаўняліся водарам насення морквы, пятрушкі, сельдэрэю, кропу, кмену, бархоткаў, хрызантэмаў, мелісы... Гэта былі пахі лета і матчыных рук, пахі зямелькі і поту гаспадароў. Гэта была надзея сям'і на заробак. За падрыхтоўкаю і клопатамі неўзаметку надыходзілі зімовыя святы, пасля якіх гаспадары выпраўляліся ў блізкія і дальнія гандлёвыя вандроўкі па гарадах былога Савецкага Саюза. А ў іх жонак, якія заставаліся на гаспадарцы, пачынаўся новы віток веснавых клопатаў: высявалі ў доўгія скрыні памідоры, лабелію, бягонію, сальвію, каб потым расаду перанесці ў парнікі і ў грады, перабіралі ў пограбе гародніну на высадкі і клубні георгінаў, прарошчвалі для пасадкі бульбу. І зноўку браліся за лапаты і *жэлезнякі*, граблі і матыкі.



Дзесяцігоддзямі ў русле незвычайнай «вэсны» павольна цякло жыццё гарадчукоў. Наканаваныя ім лёсам агарод, насенне, гандаль вызначылі іх жыццёвую пазіцыю – *трэба жыць як набэжыць*. Яны і не чакалі пераменаў, бо спадзяваліся толькі на свае рукі, на гаспадарчы вопыт і гандлёвую хватку. Ды і сам уклад жыцця амаль не змяняўся. Па колішняй завядзёнцы да нядаўняга часу мясцовыя хлопцы жаніліся толькі на гарадчанках, бо *«городчанка ўмее гороваць* (шчыра працаваць), *умее й балёваць»*. А яшчэ гарадчанкі клапатлівыя і дбайныя, кемлівыя, а часам і хітраватыя, ветлівыя і гаваркія. Ім уласцівая паляшуцкая памяркоўнасць (*«Ні ўродзіў мак – прожывом і так»*) і шляхецкая ганарліваць (*«Е* (есць), *будзэ і знаю, дзе ўзяць»*). Іх жыццёвае крэда – *«Бэз Бого ні до порога, а з Богом – і за морэ»*. Жыццёвая апора – сям'я: *чоловек* (муж) і дзеці: *«За хорошым чоловеком жонка хоць і ворона, то княгіня, а за плохім і княгіня загіне»*. Праца – аснова жыцця: *«Робота мучыць, корміць і вучыць»*. Яны працуюць у агародах да глыбокай старасці. Вобразна кажучы, гарадчанкі і ўміраюць на градах. Грошы яны ўспрымаюць не толькі як сродак існавання, але і як гарант упэўненасці ў заўтрашнім дні: *«За грошы будзэш усім хорошы»*. І па-філасофску ўспрымаюць непазбежнасць смерці: *«Дума за морэм, а смэрць за плечыма»*. Гарадчанкам не дарылі кветкі. А навошта – іх жа паўнюткі агарод?! Ды й не любяць мясцовыя жанчыны, каб расліны без карысці марнелі ў пасудзіне. Кветкі яны нясуць у царкву і шчыра моляцца, спачываючы душой, а на свята *Макавэй* асвечваюць у царкве букеты з астраў і міртавай расліны *боздороўе*. Па даўняй традыцыі гэтым букетам праводзяць у апошні шлях памерлых. Да слова кажучы, калісьці ў знак ушанавання памяці вялікамучанікаў братоў *Макавеяў* асвечаныя вяночкі дзяўчаты пускалі ў Гарынь. На жаль, гэты звычай цяпер не захаваўся.

Цяпер няма тае паўнаводнай Гарыні, што спрадвеку бруіла пад вокнамі гарадчукоў. Рака змушана нясе свае воды па абводным канале, а старое рэчышча паступова мялее і звужвае свае берагі. Няма ўжо і тых агародаў, дзе пышна красавалі кветкі-краскі. Пасля распаду Саюза стала менш рынкаў збыту насення, і былыя кветнікі на дзедавых пляцах унукі засейваюць газоннай травой.

Але кожнай вясной напамінам-дакорам прабіваюцца скрозь траву купкі незабудак і доўга-доўга глядзяць у бяздоннае блакітнае неба.

Таццяна СТАХЕЙКА,
г. Мінск

У аздабленні скарыстаныя «цікеткі» (фота Уладзіміра ПУЧЫНСКАГА)



«Я не самотны, я кнігу маю...»

Сёлета спаўняецца 105 гадоў адзінаму прыжыццёваму зборніку вершаў Максіма Багдановіча «Вянок»; кніга «адзінства паэзіі і лёсу» ўбачыла свет у Вільні, у 1913 г. З часу з'яўлення і да дня сённяшняга паэтычны зборнік маладога беларускага генія застаецца ў цэнтры ўвагі даследчыкаў-літаратуразнаўцаў, гісторыкаў, музыкаў, мастакоў і, самае галоўнае, чытачоў.

Зразумела, што і для супрацоўнікаў Літаратурнага музея Максіма Багдановіча гэтая кніга з'яўляецца надзвычай каштоўнай. Па-першае, яе структура была пакладзеная ў аснову навуковай канцэпцыі музея, кожная зала распавядае пра пэўны перыяд жыцця і творчасці М. Багдановіча і звязаная з тымі ці іншымі цыкламі зборніка. Нават пры мадэрнізацыі экспазіцыі, што вялася цягам 2011 –2016 гг., супрацоўнікі музея вырашылі пакінуць без зменаў навуковую канцэпцыю і максімальна захаваць мастацкія дамінанты першай экспазіцыі, звязаныя з творчасцю М. Багдановіча. Па-другое, зборнік «Вянок» – гэта адзін з самых каштоўных артэфактаў у музейнай экспазіцыі, ён экспануецца ў трэцяй зале, што мае назву «Росквіт творчай дзейнасці М. Багдановіча». Усяго ў мінскім музеі захоўваецца шэсць «Вянкоў», на сённяшні момант з усіх дзяржаўных установаў музей валодае самай вялікай калекцыяй, прычым кожны асобнік са сваёй цікавай гісторыяй, уладальнікамі і лёсам.

Па-трэцяе, для супрацоўнікаў Літаратурнага музея Максіма Багдановіча першы і адзіны паэтычны зборнік з'яўляецца аб'ектам розных навуковых даследаванняў. Нас даўно цікавіла пытанне, колькі кніг, выдадзеных у 1913 г., захавалася да сённяшняга дня. У часе падрыхтоўкі ў 2003 г. урачыстага святкавання 90-годдзя «Вянка» музей арганізаваў Міжнародную навукова-практычную канферэнцыю «Я не самотны, я кнігу маю...», прысвечаную гэтай знамянальнай даце, і мастацка-дакументальную выстаўку. На ёй былі прадстаўленыя арыгінальныя «Вянкі» М. Багдановіча, што захоўваюцца ў сталічных музеях і бібліятэках. На канферэнцыі Ніна Гарэлік, галоўны захавальнік фондаў Літаратурнага музея Максіма Багдановіча, агучыла даклад «І вее верш мой дзіўнай казкай...», у якім коратка распавяла пра знойдзеныя на той час 24 асобнікі, звярнула ўвагу на аўтографы і штампы, былых уладальнікаў і месцы сённяшняга захоўвання кнігі.



Супрацоўнікі музея працягваюць працу па пошуку, выяўленні, даследаванні арыгінальных зборнікаў «Вянок». Кнігі захоўваюцца ў розных установах культуры, навукі, адукацыі, а таксама ў прыватных асобаў, у Беларусі і за яе межамі. На сёння нам вядома пра 41 асобнік, кожны з іх мае свой лёс, часам надзвычай цікавы. «Вянкі» падарожнічалі па тэрыторыі Расійскай імперыі, СССР, незалежнай Беларусі і краінах свету, належалі вядомым дзеячам гісторыі і культуры свету, маюць аўтографы, дароўныя надпісы, заўвагі, штампы. Мы запрашаем чытачоў «Краязнаўчай газеты» бліжэй пазнаёміцца з арыгінальнымі «Вянкамі», прапануем шэраг невялікіх нататак. Кожная з іх будзе прысвечаная толькі аднаму асобніку, распавядзе пра яго гісторыю і былых уладальнікаў, пра іх стаўленне да кнігі М. Багдановіча і наогул да яго жыцця і творчасці, раскажа пра тое, дзе кнігі захоўваюцца цяпер і ці можна іх пачытаць.

Супрацоўнікі Літаратурнага музея Максіма Багдановіча вельмі спадзяюцца, што ў ходзе нашага аповеду пра «Вянкі» мы зможам адшукаць «новыя старыя» кнігі, якія, магчыма, захоўваюцца ў кагосьці з чытачоў «Краязнаўчай газеты». Альбо пачуць ад чытачоў парады, падказкі, дзе можа захоўвацца «Вянок» 1913 г., у якім кірунку весці пошукі музейным супрацоўнікам далей. Мы абсалютна ўпэўненыя ў тым, што наперадзе нас чакае яшчэ нямала адкрыццяў і цудоўных знаходак.

Ірына МЫШКАВЕЦ,
вядучы навуковы супрацоўнік Літаратурнага музея Максіма Багдановіча

Ад рэдакцыі. ***Па адрасе «Краязнаўчай газеты» ахвочыя могуць набыць выданне Беларускага фонду культуры, прысвечанае вершам М. Багдановіча «Раманс», «Слуцкія ткачыхі», «Пагоня», на дзесяці еўрапейскіх мовах.***

Чэмпіёнка з Мядзвядкі

Вёска Мядзвядка – радзіма вядомай беларускай спартсменкі Тамары Шыманскай, якая праславіла карэліцкую зямлю сваімі спартыўнымі дасягненнямі. Нядаўна наша зямлячка, дзесяціразовая чэмпіёнка СССР, неаднаразовая чэмпіёнка свету, абсалютная чэмпіёнка Еўропы, заслужаны майстар спорту па веславанні на байдарках, адсвяткавала свой юбілей.

Нарадзілася спартсменка ў 1948 г. у шматдзетнай сялянскай сям'і. Дзяўчынка рана страціла маці і з малых гадоў была прывучаная да цяжкай сялянскай працы. Даводзілася ва ўсім дапамагаць бацьку і мачысе: і сена сушыць, і дровы пілаваць, і бульбу капаць, і торф на балоце здабываць. Часам няпроста было спалучаць працу з вучобай, але гэта загартоўвала дзяўчынку і пазней дапамагло стаць чэмпіёнкай у такім відзе спорту, які патрабуе ад чалавека вельмі добрай фізічнай падрыхтоўкі.

У 1963 г. Тамара скончыла Мядзвядскую васьмігодку і далей працягвала вучобу ў будаўнічым вучылішчы, дзе ўсур'ёз пачала займацца спортам. На яе добрыя здольнасці і байцоўскі характар звярнуў увагу настаўнік фізкультуры і параіў заняцца веславаннем на байдарках. Дзяўчына трапіла да вопытнага трэнера Юрыя Асмалоўскага і пачала трэніравацца на Свіслачы. Ёй вельмі падабаўся гэты від спорту, і хутка з'явіліся першыя станоўчыя вынікі.

Тамара Шыманская

Пасля паступлення ў тэхнікум дзяўчына не развіталася са спортам. У 1966 г. яна прыняла ўдзел ва ўсесаюзных спаборніцтвах, дзе перамагла і стала майстрам спорту. На наступны год на міжнародных спаборніцтвах у Балгарыі Т. Шыманская зноў была першай, пасля чаго атрымала званне майстра спорту міжнароднага класа, пазней паспяхова выступіла на міжнародных спаборніцтвах у Вене.

Але найвялікшага поспеху спартсменка дасягнула ў 1969 г. На чэмпіянаце Еўропы ў Маскве яна тры разы падымалася на вышэйшую прыступку п'едэстала гонару, заваяваўшы залатыя медалі ва ўсіх трох відах жаночай праграмы – на байдарцы-адзіночцы, байдарцы-двойцы і байдарцы-чацвёрцы. На гэтых спаборніцтвах Т. Шыманская стала абсалютнай чэмпіёнкай Еўропы.

А наперадзе былі новыя старты і перамогі. У 1970 г. на чэмпіянаце свету ў Капенгагене (Данія) нашая зямлячка заваявала залаты і срэбраны медалі, пасля чаго атрымала званне заслужанага майстра спорту. Тады ж яе ўзнагародзілі медалём «За працоўную доблесць». Апошні свой залаты медаль Т. Шыманская выйграла на чэмпіянаце свету ў Фінляндыі.

За гэты час яна паспела скончыць Беларускі дзяржаўны інстытут фізічнай культуры і з 1976 г. пачала працаваць трэнерам, пазней заняла пасаду галоўнага трэнера Рэспубліканскага цэнтра фізічнага выхавання і спорту Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь. Па яе ініцыятыве праведзена шмат спаборніцтваў. Цягам шэрагу гадоў у Мінску праходзілі міжнародныя рэгаты на прыз Т. Шыманскай. Нашая зямлячка займала таксама пасаду галоўнага трэнера беларускай нацыянальнай зборнай спартсменаў-паралімпійцаў. У 2000 г. на алімпіядзе ў Сіднеі беларускія спартсмены-паралімпійцы заваявалі 23 медалі, у 2004 г. у Афінах – 29 медалёў, у 2008 г. у Пекіне – 13 медалёў. З вялікім поспехам выступіла на паралімпійскіх гульнях выхаванка Т. Шыманскай Людміла Ваўчок, якая ў Ванкуверы ў 2010 г. заваявала 2 залатыя і 2 бронзавыя медалі, у Пекіне – срэбраны медаль у спаборніцтвах па акадэмічнай грэблі, у Лондане ў 2012 г. – бронзавы медаль.

Славутай зямлячцы і яе дасягненням у спорце была прысвечаная вечарына «На хвалях лёсу», якая адбылася ў Карэліцкай раённай бібліятэцы. Школьнікі, запрошаныя на імпрэзу, змаглі пачуць расповед пра тое, як Т. Шыманская рабіла першыя крокі ў спорце на сваёй малой

радзіме і якія якасці дапамаглі ёй стаць чэмпіёнкай. Мне было прыемна падзяліцца ўражаннямі ад сустрэчы са спартсменкай у яе роднай вёсцы Мядзвядка, а таксама расказаць, як цікава было ствараць у Карэліцкім раённым музеі прысвечаную чэмпіёнцы выстаўку «Зорка беларускага спорту» і як цёпла землякі віталі Т. Шыманскую на сустрэчы ў музеі.

Святлана КОШУР

У тэатры «Зьніч»

17 мая для дзяцей пакажуць монаспектакль **«Мой маленькі прынц»** паводле аповесці-казкі Антуана дэ Сент-Экзюперы ў перакладзе Ніны Мацяш. «Зоркім можа быць адно толькі сэрца», – так сказаў маленькі хлопчык, які прыляцеў на Зямлю з астэроіда, каб знайсці сябра.



«Мой маленькі прынц»

Аўтар інсцэніроўкі, рэжысёр-пастаноўшчык – Галіна Дзягілева, выканаўца – Раіса Астрадзінава.

21 мая будзе ісці лялечны монаспектакль **«Граф Глінскі-Папялінскі»** паводле п'есы Артура Вольскага. Рэжысёр і выканаўца Вячаслаў Шакалідо распавядзе маленькім гледачам незвычайную гісторыю пра двух сяброў. Пасля розных прыгодаў і з дапамогаю свайго разумнага сябра ката Максіма хлопец-сірата Марцін ператварыўся ў графа Глінскага-Папялінскага...

Увечары на сцэне паэтычны монаспектакль «Не праклінай, што я люблю» паводле вершаванага рамана Ніла Гілевіча «Родныя дзеці». Даследчык беларускага фальклору і побыту, тонкі знаўца жывой народнай гаворкі, Н. Гілевіч стварыў своеасаблівую паэтычную сюіту, дзе гарманічна знітаваліся гумарыстычныя ноты і шчымлівая музыка кахання, дзе чуюцца напевы роднай зямлі... На сцэне гэта перадаў выканаўца Мікалай Лявончык. Аўтар інсцэніроўкі і рэжысёр-пастаноўшчык – Галіна Дзягілева. Музычнае суправаджэнне Дар'і Неўмяржыцкай (цымбалы).

23 мая будзе ісці прэм'ерны монаспектакль **«Мама»** паводле фантастычнай п'есы чэшскага драматурга Карэла Чапэка і вершаў народнага паэта Беларусі Рыгора Барадуліна, якія ён прысвяціў сваёй маці. Чым чалавек трымаецца ў жыцці? Што дапамагае яму выжыць пад час катастрофы? Толькі сапраўдныя каштоўнасці: спачуванне, надзея, вернасць, абавязак – і любоў, якая застаецца, нават калі нашых родных ужо няма побач. І вось вакол мамы Далорэс збіраюцца яе сыны – урач Ондра, лётчык Іржы, Карнэль, Пётра і малодшы Тоні, які піша вершы. Сюжэт спектакля запрашае гледачоў да шчырай размовы пры святле хатняй лямпы...

Аўтар інсцэніроўкі, рэжысёр-пастаноўшчык, выканаўца – Галіна Дзягілева. Мастак-пастаноўшчык – Андрэй Меранкоў, кампазітар – Алег Залётнеў.

Спектаклі праходзяць у тэатральнай зале Культурнага цэнтра касцёла Св. Сымона і Св. Алены. Дзіцячыя пастаноўкі пачынаюцца а 15-й гадзіне, дарослыя – а 19-й. Дадатковую інфармацыю можна атрымаць па мінскім тэлефоне: 331-75-53.

Сяргей ПАНІЗЬНІК

Пры ўскалыхах адвечных званоў — рупліўцы твае, Беларусь

Прысвячаецца валачобніку Арсеню Лісу

Зноў песня прасілася ў свет...
Маланкі пякучае след
свабодзе дарогу прабіла.
Балткрывія Вас палюбіла:
мацнела ад Вашых бясед
у знойдзеных постацях сіла.
Вы, вечны вандроўнік, у руху!
Прысады жыцця – у фальклоры.
Хай Вётхава дасць Вам напругу,
а Gloria victis у творы –
высакароднага духу.
Быць Вам, званару, – у нязморы!

Неабходныя тлумачэнні ад аўтара.

У вёсцы Вётхава на Смаргоншчыне 4 лютага 1934 г. нарадзіўся Арсень Ліс – будучы фалькларыст, літаратуразнаўца, літаратар, доктар філалагічных навук. Імя Арсеня Сяргеевіча занесенае ў беларускую Кнігу гонару «Рупліўцы твае, Беларусь». Ён – адзін з укладальнікаў шматтомнага акадэмічнага збору «Беларуская народная творчасць». У 1993 г. стварыў сцэнарый дакументальнага фільма пра Мітрафана Доўнар-Запольскага «Адвечныя званы», у 1985 г. – «Прысады жыцця» (пра Максіма Гарэцкага). Аўтар працаў пра фалькларыста Антона Грыневіча «Песня прасілася ў свет» (1989), «Пякучай маланкі след: Эцюды да

партрэта мастака Горыда» (1981), «Вечны вандроўнік: нарыс пра мастака Я. Драздовіча» (1984), кнігаў «Цяжкая дарога свабоды» (1994), «Gloria victis» (2008). Балткрывіяй называюць Беларусь суседзі-латышы.

Май

10 – Янка Маўр (сапр. **Фёдараў Іван Міхайлавіч**; 1883, Латвія – 1971), беларускі пісьменнік, заслужаны дзеяч культуры Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1968) – 135 гадоў з дня нараджэння.

12 – Некрашэвіч Леанід Міхайлавіч (1948, Калінкавіцкі р-н), спявак, заслужаны артыст Беларусі, лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі (1977), узнагароджаны ордэнам Ф. Скарыны – 70 гадоў з дня нараджэння.

13 – Кішчанка Аляксандр Міхайлавіч (1933, Расія – 1997), народны мастак Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1960, 1996), узнагароджаны медалём Ф. Скарыны – 85 гадоў з дня нараджэння.

14 – Ватацы Ніна Барысаўна (1908 – 1997), бібліёграф, літаратуразнаўца, заслужаны дзеяч культуры Беларусі – 110 гадоў з дня нараджэння.

15 – Гільдзюк Юрый Мікалаевіч (1948, Гродна), піяніст, педагог, заслужаны артыст Беларусі – 70 гадоў з дня нараджэння.

15 – Пянчук Барыс Міхайлавіч (1918 – 2009), дырыжор, педагог, народны артыст Беларусі, лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі (1972) – 100 гадоў з дня нараджэння.

16 – Луцэвіч Анатоль Васільевіч (1938, Уздзенскі р-н – 2002), акцёр тэатра і кіно, заслужаны артыст Беларусі – 80 гадоў з дня нараджэння.

18 – Брагінскі гістарычны музей з карціннай галерэяй (Брагін; 1988) – 30 гадоў з часу адкрыцця.

18 – Казінец Міхаіл Антонавіч (1938, Вілейскі р-н), дырыжор, педагог, народны артыст Беларусі, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1984), спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне» (2002), узнагароджаны ордэнамі Дружбы народаў, Пашаны, медалём Ф. Скарыны – 80 гадоў з дня нараджэння.

20 – Бяссмертны Аркадзь Львовіч (1893 – 1955), беларускі скрыпач, дырыжор, педагог, заслужаны артыст Беларусі – 125 гадоў з дня нараджэння.

Адказы на крыжаванку, змешчаную ў № 16

Уздоўж: **1**. Кветкі. **4.** Падсак. **7.** Вяз. **8.** Рукаў. **11.** Гнеды. **12.** Вербніца. **13.** Лярд. **15.** Спец. **16.** Поле. **17.** Гай. **18.** Гея. **19.** Норд. **22.** Рунь. **23.** Ягня. **28.** Ястрабок. **30.** Попел. **31.** Аборы. **32.** Два. **33.** Каровы. **34.** Хустка.

Упоперак: **1.** Кураслеп. **2.** Елка. **3.** Вярба. **5.** Свет. **6.** Крыніца. **9.** Лес. **10.** Міг. **11.** Га. **14.** Дзевяць. **15.** Сягоння. **20.** Дзяўчына. **21.** Краспак. **24.** Ату. **25.** Барва. **26.** Год. **27.** Спор. **28.** Ял. **29.** Чорт.

Сабакі – абаронцы Радзімы

Уздоўж

1. ... «За баявыя заслугі». Урадавая ўзнагарода; ёю быў узнагароджаны адзіны сабака-воін па мянушцы Джульбарс, які ў гады Вялікай Айчыннай вайны (ВАВ) удзельнічаў у разміраванні шэрагу аб'ектаў заходнееўрапейскіх краінаў, затым прымаў удзел у парадзе Перамогі на Краснай плошчы. **4**. Парода сабакі з мянушкай Бобік, які ў час ВАВ вывез на калясцы з поля бою больш за 1500 параненых байцоў. **7**. Баявая машына. У знішчэнні нямецкіх ... у часы ВАВ удзельнічала шмат сабак-камікадзэ, якія падарвалі і сябе, і звыш 300 баявых машын ворага. **9**. Слабы парыў ветру. **10**. Летні ваенны галаўны ўбор. **11**. Асяроддзе, склад. **12**. ...! Баявы вокліч войск. **13**. Мянушка легендарнага сабакі пароды колі, які ў часы ВАВ прымаў удзел у разміраванні гарадоў Сталінграда, Прагі, Лісічанска, Паўлаўска і як сабака-ветэран быў пахаваны з воінскімі ўшанаваннямі. **15**. Імклівы напад, атака. **16**. Аглядзелася нявестка праз ... год, што сучка без хваста (прык.). **18**. Тутавае дрэва. **19**. Парода пакаёвых сабак з доўгай кучаравай поўсцю, якія ў часы вайны выкарыстоўваліся як сабакі-сувязныя і як шукальнікі варожых мінаў. **22**. Высокі слуп для ветразяў на судне. **23**. Мянушка аднаго з сабак-сувязных, якія ў часы вайны даставілі звыш 120 тысячаў баявых данясенняў і праклалі 8 тысячаў кіламетраў тэлефоннага дроту. **24**. Распаўсюджаная мянушка сабакі; яе носіць герой цікавага польскага тэлесерыяла «Чатыры танкісты і сабака». **25**. У баі ... – святы закон, даражэйшы жыцця ён (прык.).

Упоперак

1. Парода пакаёвых сабак з вялікай круглай галавой. **2**. Той, хто здзяйсняе дыверсіі. Да сабак-... адносіцца аўчарка Дзіна, якая ў час вайны на чыгуначным перагоне Полацк – Дрыса (Верхнядзвінск) падарвала варожы эшалон; удзельнічала яна і ў разміраванні Полацка. **3**. Сабака – ... на сваёй вуліцы (прык.). **5.** Паселішча на Каўказе. **6**. Сабака здох, дык хай ... брэша (прык.). **8**. Звод законаў. **11**. Той, хто вядзе разведку. ... у часы вайны быў сабака Джэк, на ліку якога было больш за 20 захопленых варожых «языкоў». **14**. Мянушка легендарнага сабакі-санітара, які за часы вайны вынес з поля бою болей за 400 цяжка параненых байцоў. Такая самая мянушка і ў сабакі з мастацкага кінафільма «Да мяне, ...!» аб сяброўстве міліцыянера і сабакі. **17**. Дзяржаўнае аб'яднанне. **20**. ... боты – пара (прык). **21**. 28-я літара старажытнарускага алфавіта. **22**. Дружна за ... стаяць – вайны не відаць (прык.).

Склаў Лявон ЦЕЛЕШ

Малая краязнаўчая энцыклапедыя

(Пачатак у № 1 за 2003 год)

ПАРХУ́ТА Яросла́ў Сільве́стравіч (08.03.1930, в. Мілейкі Івацэвіцкага р-на – 20.03.1996, Мінск) – беларускі пісьменнік, краязнаўца. Вучыўся на аддзяленні журналістыкі філалагічнага факультэта БДУ (1949 – 1952), скончыў Вышэйшую партыйную школу пры ЦК КПБ у Мінску (1973). З 1956 г. – літсупрацоўнік, загадчык аддзела поразаўскай раённай газеты «Ленінскі шлях», з 1959 г. – намеснік рэдактара ружанскай раённай газеты «Заветы Леніна», з 1961 г. – рэдактар гарадзішчанскай раённай газеты «Советская Родина», з 1962 г. – намеснік рэдактара, загадчык аддзела баранавіцкай міжраённай газеты «Знамя коммунизма», у 1965 – 1969 гг. – загадчык аддзела, намеснік рэдактара маларыцкай раённай газеты «Сельскае жыццё». У 1973 – 1977 гг. працаваў намеснікам рэдактара, рэдактарам аддзела часопіса «Вожык», у 1978 – 1982 гг. – рэдактарам аддзела часопіса «Родная прырода».

Друкаваўся з 1946 г. Першы верш апублікаваў у 1949 г. (брэсцкая абласная газета «Заря»). Пісаў вершы і прозу. У артыкулах і нарысах завастраў праблемы аховы прыроды, экалагічнага стану Беларускага Палесся.

Аўтар вершаваных казак «Казка зялёнай дубровы» (1960), «Перапёлачка» (1979), кніг прозы «Там, дзе жыве Юлька» (1978), «Зямля бацькоў нашых» (1988), «Дарогамі надзеі і трывог» (1989), «Крыніца ёсць у родным краі...» (1992), «Жальба жытняга коласа» (1993) і інш., нарысаў і замалёвак пра беларускую прыроду. Светлыя пачуцці першага кахання, радасць творчай працы, прыгажосць роднай зямлі – асноўная тэма кнігі «Ты пайшла ў сонца» (1973). Працаваў і ў жанры сатыры і гумару (зб. «Мудрая цялушка», 1976). У 1995 г. выйшла дзіцячая кніга «Казкі дзеда Яраслава». Асобныя яго творы перакладзеныя на рускую, украінскую і ўзбекскую мовы.

У 1992 г. за кнігу «Зямля бацькоў нашых» Я. Пархута атрымаў Дзяржаўную прэмію Беларусі імя Кастуся Каліноўскага.

Займацца краязнаўствам Я. Пархута пачаў, працуючы ў часопісе «Родная прырода». Ён пехатой абышоў усю Беларусь – ад Браслаўскіх азёраў да Прыпяці, ад кручаў Дняпра да Буга. Наведваў мясціны, звязаныя з жыццём і дзейнасцю пісьменнікаў, вучоных, грамадскіх дзеячаў. Меў свой падыход да пошукаў, да апісання мясцінаў: імкнуўся разабрацца, як уплываюць на росквіт асаблівага таленту родная прырода, радзінная зямля, яе людзі. Любіў пагутарыць з мясцовымі жыхарамі, найчасцей старэйшага веку, распытаць, ці памятаюць яны што-небудзь пра іх славутага земляка. У 1990-я гг. пры падтрымцы рэдакцыі газеты «Дзеці і мы» планаваў стварыць цыкл нарысаў пра вёскі з назваю Крывічы (наведаў некалькі, вытрымкі надрукаваныя ў газеце).

ПАРЭ́БРЫК *у архітэктуры* – прыём арнаментальнай цглянай ці каменнай муроўкі ўстаноўкай цаглінаў (абчасаных камянёў) пад вуглом да вонкавай паверхні сцяны. Звычайна парэбрыкі ўтваралі дэкаратыўныя гарызантальныя фрызы і паяскі і спалучаліся з інш. элементамі аздаблення. У беларускай архітэктуры выкарыстоўваліся ў пабудовах XVI ст. стыляў готыкі і рэнесансу (замак у г.п. Мір Карэліцкага р-на), у 2-й пал. XIX – пач. XX ст. у будынках стыляў несапраўднай готыкі, псеўдарускага і «мадэрн» [Барысаўскі сабор, будынак царкоўна-археалагічнага музея Архірэйскага падвор'я (у савецкія часы – Дома працаўнікоў мастацтва) у Мінску].

Парэбрык у цокале вежы Мураванкаўскай царквы-крэпасці

Газета зарэгістравана ў Міністэрстве інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Рэгістрацыйнае пасведчанне № 384 ад 08 мая 2014 г. Заснавальнікі: грамадскае аб'яднанне «Беларускі фонд культуры»; Гілеп Уладзімір Аляксандравіч.

Краязнаўчая газета

Індэкс індывідуальнай падпіскі – 63320
ведамаснай – 633202

Галоўны рэдактар – Уладзімір ГІЛЕП.
Намеснік галоўнага рэдактара Уладзімір Пучынскі.
Рэдкалегія: Анатоль Бутэвіч, Навум Гальпяровіч, Вітольд Ермалёнак, Алесь Карлюкевіч, Людміла Кірухіна, Адам Мальдзіс, Сяргей Мітраховіч, Вячаслаў Рагойша, Павел Сапоцька, Віктар Скорабагатаў, Тадэуш Стружэцкі.

Наш адрас: 220029, г. Мінск, вул. Траецкая набярэжная, 6. Тэл. 283-28-26. Тэл./факс 334-42-03
E-mail: kraga@tut.by

З-за абмежаванасці сродкаў выданне безганарарнае. Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Аўтары допісаў у рэдакцыю паведамляюць сваё прозвішча, імя і імя па бацьку, асноўнае месца працы, зваротны адрас. Меркаванні аўтараў могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі. Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў. Пры перадруку спасылка на «Краязнаўчую газету» абавязковая.

Падпісана да друку: 10.05.2018
Газета надрукавана ў друкарні ТДА «Знамение» (Мінск, вул. Каржанеўскага, 14). Ліцэнзія ЛП № 02330/85 ад 23.01.2014.
Заказ 283.
Тыраж 520 асобнікаў.